Подобные композиции также характерны для Богоявленской церкви в Могилеве и Троицкой церкви в Витебске. Общим признаком, характерным для этих иконостасов является отсутствие в них праздничного ряда, а также отсутствие классического деисусного ряда, который фактически заменен апостольским. Для искусства Московской Руси этого периода деисусный ряд имел особое мистическое значение: «высота его превысила размеры остальных рядов, демонстрируя иерархическое превосходство. Доминантой стала центральная икона чина с изображением Христа среди небесных сил в день Страшного суда. Всевышний предстает в образе видений ветхозаветных пророков. Мир земной и мир небесный в графических проекциях неоплатонических символов (земля – куб, небо – сфера) – Его совершеннейшие творения, над которыми и вне которых он царит в Вечности» [5, с. 14]. Роль деисуса в иконостасах могилевских и витебских храмов выполняет один центральный образ – Спас с предстоящими. Как полагают исследователи, идея моления, доминирующая в русском иконостасе, выраженная там через деисусный ряд, с его чередой архангелов, апостолов и святителей, подчиненных композиционно изображению Христа, в белорусском иконостасе уступает философскому обоснованию веры, выраженному через апостольский ряд. «Апостолы, представленные в естественных, живых позах, композиционно не подчинены главной иконе Христа, а как бы ведут беседу с присутствующими в храме» [1, с. 188], выступая как «собеседники и наставники паствы» [5, с. 16]. В белорусских храмах XVII в. «символическая программа московских иконостасов оказалась преобразованной. Содержание ее утратило мистический накал, пафос обращения к Вечности, свойственные средневековому мироощущению» [5, с. 15]. В этом можно усмотреть влияние ренессансных идей на развитие белорусского искусства.

Таким образом, иконостас Свято-Николаевской церкви в Могилеве является удивительным феноменом христианского искусства, отразившем мировоззрение и тенденции развития культуры на восточно-белорусских землях XVII в.





**Литература и источники**

1. Ветер, Э.И. Об особенностях белорусского иконостаса / Э.И. Ветер // Художественное наследие. Хранение, исследование, реставрация. – Москва: ГОСНИИР, 1978. – № 4 – С.187–192.
2. Гісторыя беларускага мастацтва: У 6 т. / рэдкал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск: Навука і тэхніка, 1987 – 1994. – Т. 2: Другая палова XVI ст. – канец XVIII ст. / рэд. тома Я.М. Сахута. – Мінск: Навука і тэхніка, 1988. – 384 с.
3. Кацер, М.С. Народно-прикладное искусство Белоруссии (от первобытного общества до 1917 г.) / М.С. Кацер. – Минск: Вышэйшая школа, 1972. – 176 с.
4. Путевые заметки стольника П. А. Толстого о могилевской губернии в 1697-1699 гг. // Могилевская старина: Сборник статей «Могилевских губернских ведомостей» / под. ред. Е. Р. Романова. – Могилев, 1900. – Вып.1 – 1898–1899 гг. – С. 43–49.
5. Шамардина, Н.В. Иконостас периода позднего средневековья: Восточно-славянские пересечения / Н.В. Шамардина // Вестник Балтийского федерального университета им. И. Канта. Серия: Гуманитарные и общественные науки. – 2015. – № 12. – С. 13–20.

## СТВАРЭННЕ ЎМОЎ ДЛЯ ФАРМІРАВАННЯ САЦЫЯЛЬНА ПАСПЯХОВАГА ВУЧНЯ – АДНА З АСНОЎНЫХ ЗАДАЧ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

*Алянюк Г.А.*
*(Бялынічы, Беларусь)*

Фарміраванне ведаў, уменняў, навыкаў, інтэлектуальнае, духоўнае, творчае і фізічнае развіццё асобы з’яўляецца важным прыярытэтным

напрамкам работы агульнаадукацыйных устаноў. Асоба вучня – гэта “канкрэтны вынік, сінтэз і ўзаемадзеянне надзвычай разнастайных фактараў” [4, с. 211], сярод якіх асноўным з’яўляецца асяроддзе. Нагогул пад асяроддзем звычайна падразумеваецца сукупнасць прыродных і сацыяльных (у дадзеным выпадку менавіта педагагічных) умоваў, а таксама людзей, прадметаў, з’яваў, якія вызначаюць і характарызуюць жыццядзейнасць грамадства, яго суб’ектаў. Змены ў грамадстве, эканоміцы, палітыцы, культурным жыцці на працягу жыцця настолькі значныя, што кансерватызм школьнай практыкі часта аказваецца тормазам сацыяльнага развіцця, абмяжоўвае магчымасці выпускнікоў школ у самарэалізацыі, паспяховай дзейнасці ў нашым поліпраблемным і зменлівым свеце.

Але мяняецца час – мяняемся і мы разам з ім. І патрэбы новага часу прымушаюць шукаць шляхі да іх задавальнення. Сучасная школа, згодна Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, заклікана забяспечыць духоўнае і фізічнае станаўленне асобы, падрыхтоўку маладога пакалення да паўнацэннага жыцця ў грамадстве, выхаваць грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, дапамагаць яму авалодваць асновамі навук, мовамі, якія маюць статус дзяржаўных, навыкамі разумовай і фізічнай працы, фарміраваць у вучняў маральна-этычныя погляды, культуру паводзін, эстэтычны густ і здаро¬вы лад жыцця[3, с. 20–21].

Для паспяховай рэалізацыі гэтых мэтаў патрабуецца абнаўленне дзейнасці агульнаадукацыйнай школы. Як адзначае А.А.Глінскі, “на сучасным этапе асэнсавана неабходнасць не толькі асобаснага развіцця вучня з улікам яго здольнасцяў, магчымасцей і інтарэсаў, павышэния адказнасці ўстаноў адукацыі пе¬рад дзяржавай і соцыумам за якасць навучання і выхавання падрастаю¬чага пакалення, але і выкарыстоўваюцца новыя адукацыйныя тэхналогіі з мэтай развіцця пазнавальнай, пошукавай, мысліцельнай актыўнасці навучэнцаў; узмацняецца тэарэтычная і метадычная падрыхтоўка настаўніка для работы ў новых умовах” [2, с. 19].





На першае месца сёння выходзіць праблема ўкаранення эфектыўных адукацыйных тэхналогій, галоўная задача якіх – не толькі вучыць школьнікаў, але і навучыць іх вучыцца; не толькі даваць веды, але і развіваць асобу. Педагогі ўсведамляюць значнасць абнаўлення форм і метадаў навучання і выхавання, звязваючы гэтыя працэсы з неабходнасцю ўкаранення сістэмна-дзейнаснага падыходу да працэсу выкладання прадмета, патрэбай актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў, замены малаэфектыўных славесных сродкаў перадачы ведаў і выхавання магчымасцю праектавання сумеснай дзейнасці вучняў і настаўніка.

На сучасным этапе існуе рэальная праблема недастатковa эфектыўнай работы школы па забеспячэнні неабходнага ўзроўню сацыялізацыі выпускнікоў. Вучні павінны апераваць шэрагам новых кампетэнцый або здольнасцей: аргдзейнасных, інтэлектуальных, камунікатыўных і інфармацыйных, якія забяспечваюць сацыялізацыю чалавека ў сучасным свеце. Многія навучэнцы “недаатрымліваюць” тых ведаў і ўменняў, якія прадугледжаны вучэбнымі праграмамі і патрабуюцца ад абітурыентаў навучальных устаноў. Таму неабходна павышэнне рэзультатыўнасці адукацыйнага працэсу за кошт змянення падыходаў да яго арганізацыі, увядзення інавацыйных адукацыйных тэхналогій.

Існуе праблема здароўя дзяцей. Страх атрымаць дрэнную адзнаку, няправільна адказаць забараняе вучням праявіць творчасць. Часта ініцыятыва школьнікаў гасне з-за боязі парушыць патрабаванні настаўніка.

Негатыўна сказваецца на самаадчуванні вучняў вучэбная перагрузка, псіхалагічны дыскамфорт на ўроку. Прычыны страху, дыскамфорту, няўпэўненасці знікаюць пры прымяненні на ўроках беларускай мовы тэхналогіі французскіх педагагічных майстэрняў, якая забяспечвае гуманізм адносін удзельнікаў адукацыйнага працэсу, паспяховае авалоданне вучняў ведамі.

Для значнай часткі педагогаў актуальна праблема прафесійнага дыскамфорту. Яна звязана з незадавальненнем як самім адукацыйным працэсам, які яны арганізоўваюць на ўроках, так і яго вынікамі. Настаўнік разумее, што, засвойваючы гатовыя веды, вучань вучыцца быць спажыўцом, становіцца, у лепшым выпадку, добра інфармаваным чалавекам. Педагог асэнсоўвае неабходнасць вучыць па-іншаму, выкарыстоўваць такія адукацыйныя тэхналогіі, якія забяспечаць ўнутраную матывацыю пазнавальнай дзейнасці вучняў, належнае засваенне вучэбных праграм, паспяховую сацыялізацыю школьнікаў, псіхалагічны камфорт на ўроку. Пры гэтым асваенне і прымяненне інавацыйнай тэхналогіі французскіх педагагічных майстэрняў стварае такі адукацыйны прастор, у якім існуюць умовы для творчай самарэалізацыі і вучняў, і настаўніка.

Праблема актывізацыі творчай, пазнавальнай, пошукавай дзейнасці на ўроках беларускай мовы была і застаецца адной з самых актуальных. На працягу доўгага часу яна знаходзіцца ў цэнтры ўвагі шэрагу навуковых педагагічных калектываў і практычных педагогаў. Вучоныя і настаўнікі даўно вядуць пошук шляхоў актывізацыі дзейнасці вучняў. Тэма гэта вялікая і цікавая, школе патрэбны такія тэхналогіі, формы і метады навучання, якія дазволілі б вучыць дзяцей мысліць, разважаць. Сістэма ведаў па беларускай мове патрэбна вучню не толькі сама па сабе, а больш для вырашэння разнастайных тэарэтычных і практычных задач. Таму вучоныя, настаўнікі-практыкі сталі шукаць адказ на пытанне аб фарміраванні агульных прыёмаў творчай, пошукавай, пазнавальнай дзейнасці, агульных падыходаў да вырашэння любой праблемы ў любой новай сітуацыі.

У сучасных навукова-метадычных даследаваннях праблема актывізацыі дзейнасці вучняў вырашаецца ў розных аспектах вучонымі розных напрамкаў. Распрацоўцы пытанняў, звязаных з актывізацыяй дзейнасці вучняў на ўроках, эфектыўнасцю прымянення тэхналогіі французскіх педагагічных майстэрняў, прысвяцілі свае





даследаванні псіхолагі, дыдакты, метадысты: С.Л. Рубінштэйн, П.Я. Гальперын, В.В. Давыдаў, Д.Б. Эльконін, М.І. Махмутаў, Г.І. Шчукіна, Ю.К. Бабанск, В.М. Шаталаў, Я.Г. Шатава, А.А. Окунеў, С.С. Кашлеў, С.В. Кручынін, Г.М. Пятроўскі, Д.Г. Левітас, М.І. Запрудскі, Г.І. Дабрынеўская, Н.Е. Шчуркова, Г.К. Селеўка, М. Кныш і інш.

На пачатку трэцяга тысячагоддзя праблема фарміравання асобы дзіцяці з высокімі маральнымі якасцямі, з устойлівай і абдуманай сістэмай унутранага самакантролю і норм жыцця даволі значная і цяжкая. Таму адна з асноўных задач навучання – стварэнне умоў для фарміравання сацыяльна паспяховага вучня. З гэтай нагоды ў навучальных установах асаблівая ўвага надаецца выхаванню інтэлектуальна развітай асобы. Кожны настаўнік імкнецца ствараць пэўныя ўмовы для набыцця вучнямі ўстойлівых ведаў, прывіць цікавасць да свайго прадмета праз выкарыстанне новых адукацыйных тэхналогій.

Павышэнню актывізацыі творчай, пошукавай, пазнавальнай дзейнасці вучняў на ўроках беларускай мовы садзейнічаюць элементы праблемнага і праграміраванага навучання, абагульненне ў працэсе вывучэння матэрыялу, новыя падыходы да выкарыстання розных сродкаў мадэліравання і нагляднасці, індывідуальная, групавая, франтальная і парная работа.

На сучасным этапе выпускнік навучальнай установы павінен вырашаць праблемы, прымаць самастойныя рашэнні, супрацьстаяць няўпэўненасці; займацца самаадукацыяй; працаваць з дакументамі; крытычна ставіцца да таго ці іншага аспекту грамадскага жыцця; адстойваць сваю думку; працаваць у групе, згладжваць канфлікты; адчуваць адказнасць за работу; быць мабільным, гібкім у розных сітуацыях і інш. Валоданне гэтымі ўменнямі дапаможа маладому чалавеку ўладкавацца ў жыцці. Таму іх можна разглядаць як найважней¬шую частку агульнай сярэдняй адукацыі. Н.М.Рагатоўская адзначае, што “тут вельмі важна разумець, што авалодаць гэтымі кампетэнцыямі

можна толькі шляхам пазнавальнай дзейнасці вучняў. Каб навучыцца супрацоўнічаць – трэба супрацоўнічаць. Нельга навучыцца дэмакратыі ў рамках аўтарытарна арганізаванага педагагічнага працэсу. Калі толькі слухаеш настаўніка – станеш добрым слухачом. Не больш. Навучышся рабіць выгляд, што ўважлівы; думаць, як абхітрыць настаўніка на заліку; спісаць...” [1, с. 8–9].

Для актывізацыі дзейнасці вучняў вельмі важным з'яўляецца развіццё такой працэснай сістэмы, якая своечасова скаардынавала б навучальную дзейнасць. Такая сістэма – адукацыйная тэхналогія (у прыватнасці, тэхналогія французскіх педагагічных майстэрняў), скіраваная на сумесную дзейнасць вучняў і настаўніка па праектаванні (планаванні), арганізацыі, арыентаванні і карэкцыі адукацыйнага працэсу для дасягнення канкрэтных вынікаў навучання пры забеспячэнні камфортных умоў для яго ўдзельнікаў.

Пры выкарыстанні тэхналогіі французскіх педагагічных майстэрняў акрэсліваецца прастора супрацоўніцтва настаўніка і вучня: дакладную праграму працы будуе не толькі педагог, вучань кіруе сваім навучаннем; ствараюцца камфортныя ўмовы дзейнасці суб'ектаў адукацыйнага працэсу, на працягу якога рэалізуецца і развіваецца асабісты патэнцыял школьнікаў.

Рэалізацыя дадзенай тэхналогіі выключае маніпуляцыю вучнем, павышае яго адказнасць за ход і вынік урока. дапамае дасягнуць такога ўзроўню разумення жыцця, выпрацаваць такую патрабаванасць да творчага развіцця грамадзяніна, чалавека, каб кожны адчуў сябе творчай, актыўнай асобай, імкнуўся да пазнання вывучаемага матэрыялу.

### Літаратура і крыніцы

1. Выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій на ўроках беларускай мовы і літаратуры / В.У. Бухавец [і інш.]; пад агул. Рэд. С.І.Цыбульскай. – Мінск : Сэр-Вит, 2006. – 208 с.
2. Глинский, А.А. Современные подходы к совершенствованию общешкольной методической работы // Веснік адукацыі. – 2006. – № 6. – С.19–23.
3. Кодекс Республики Беларусь об образовании 13 января 2011 г. № 243 – 3: принят Палатой представителей 2 дек. 2010.: одобр. Советом Респ. 22 дек. 2010 г. – Мозырь : Белый Ветер, 2011. – 379, [1] с.
4. Социальная философия. – Москва, 1995.





## БИБЛЕЙСКИЕ ПРИНЦИПЫ И СОВРЕМЕННЫЕ НРАВСТВЕННО-ЭКОНОМИЧЕСКИЕ КОЛЛИЗИИ

*Гриценок Т.Е.*
*(Минск, Беларусь)*

«… ибо трудящийся достоин награды за труды свои» (Лк. 10.7)

В биографии Митрополита Иосифа (в миру Иосиф Иосифович Семашко) говорится, что он с юных лет отличался трудолюбием и тягой к знаниям.

Современная экономика, экономика знаний, характеризуется развитием производств, в основе которых лежит интеллектуальный труд. Труд – всегда был основой для человеческой жизни и культуры. Как считал В.А. Сухомлинский [1, с. 28], «труд для народа является не только жизненной необходимостью, без которой не мысленно человеческое существование, но и сферой многогранных проявлений духовной жизни, духовного богатства личности».

Вы можете купить руки человека, но купить его душу невозможно. Его душа – то место, где рождаются энтузиазм и преданность. Вы можете купить его спину, но не его ум, а ведь именно в нем сосредоточены творчество, мастерство и изобретательность [2, с. 75].

Отсутствие стимула к работе, физические, эмоциональные и духовные расстройства, возможное банкротство и нищета, разрушен-